УДК 72.05:296.735(476.6)

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ ГОРОДА АСТРАВЕЦ – КАСЦЁЛ СВЯТЫХ КОСМЫ І ДАМІЯНА, КАСЦЁЛ УЗНЯСЕННЯ СВЯТОГА КРЫЖА

*М.К. ШАЎЛІС*
*(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)*

*Разглядаюцца касцёл святых Космы і Даміяна і касцёл Узнясення Святога Крыжа як гісторыка-культурныя каштоўнасці города Астравец. Прасочана гісторыя іх стварэння і функцыянавання ў сувязі з асноўнымі гістарычнымі вехамі самога гарада.*

Астравец – горад на рацэ Лоша, адміністрацыйны цэнтр Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. Тапонім «Астравец» мае славянскае паходжанне і ўтварыўся ад шматзначнага паняцця «востраў» (на правым беразе ракі Лоша, што цячэ праз усё мястэчка, некалі існавала ўмацаваная выспа) [1].

Паводле дакументальных гістарычных звестак, Астравец – трэці па старажытнасці населены пункт рэгіёна, пасля Быстрыцы і Варнян. Упершыню назва Астравец згадваецца ў дакуменце 1468 года, якім уладальнік Геранёнаў Юрый Гаштольд запісаў штогадова парафіяльнаму касцёлу Дзевы Марыі і Ўсіх Святых у Астраўцы дзве меры мёду са свайго маёнтка Парэчча. Гэты фундушавы запіс сведчыць, што касцёл у Астраўцы тады ўжо існаваў, але не меў фундушоў ці яго даходы былі недастатковыя, бо запіс усяго дзвюх мераў мёду яўна быў дапаўненнем невядомага нам ранейшага фундуша.

Раней доўгі час першай згадкай пра Астравец лічылася дата заснавання тут касцёла ордэна дамініканцаў у гонар св. Космы і Даміяна – 1474 г. (мал. 1).



Мал. 1. Касцёл святых Космы і Даміяна, Астравец

Па часе фундацыі гэта самая старажытная на Беларусі святыня вельмі пашыранага на беларускіх землях каталіцкага ордэна, які праводзіў місіянерскую і асветніцкую дзейнасць, пераважна ў сферы адукацыі шляхецкай моладзі. Першы касцёл, пабудаваны на ахвяраванні кіеўскага ваяводы Марціна Гаштольда, быў драўляным. На яго месцы ў 1616 годзе па фундацыі Яна, Мікалая і Алены Корсакаў узведзены мураваны храм, знішчаны казакамі ў сярэдзіне XVII стагоддзя. На мяжы XVII–XVIII стагоддзяў. Астравецкі касцёл зноў пазначаны ў інвентарах як драўляны. Храм, які існуе зараз, змураваны на сродкі Гілярыя Цішэўскага ў 1785–87 гадах у характэрных для гэтага часу формах позняга барока. Але ў па-чатку XIX стагоддзя касцёл быў істотна перабудаваны і набыў пры гэтым рысы посткласіцызму [2].

Святыня ўяўляе трохнефавую базіліку з плоскай алтарнай сцяной прэсбітэрыя і фасадам-нартэксам, які па задуме мусіў быць двухвежавым. Па баках прэсбітэрыя ўкампаваны сіметрычныя сакрысціі. Усе часткі храма аб’яднаны ў строгім прамавугольньш аб’ёме, накрытым пасля перабудовы агульным двухсхільным дахам. Цэнтр галоўнага фасада вылучаны чатырохкалонным іянічным порцікам вялікага ордэра з трохвугольным франтонам. Верхнія ярусы вежаў адсутнічаюць, іх ніжнія чацверыкі завяршае масіўны атык, аздоблены арачнымі нішамі. Фасады рытмічна расчлянёныя шырокімі пілястрамі. За манументальнай класіцыстычнай стылістыкай фасада ўжо цяжка ўбачыць барочны характар архітэктонікі храма. Унутры шырокі цэнтральны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі на падпружных арках, бакавыя нефы – крыжовымі скляпеннямі. У інтэр’еры захоўваюцца каштоўныя абразы XVIII–XIX стагоддзяў.

Пасля жорсткага падаўлення царскай Расіяй паўстання 1863–1864 гадоў па Астравецкай зямлі пракацілася хваля рэпрэсій. А паколькі паўстанцаў актыўна падтрымлівалі касцёлы і кляштары, пакаралі і іх: па загаду царскіх міністраў каталікі, так званага, Заходняга краю страцілі ў той перыяд 359 сваіх храмаў.

На Астравеччыне былі зачынены касцёл Наведання Панны Марыі і кляштар кармелітаў у Гудагаі, а Быстрыцкі і Астравецкі касцёлы былі перароблены пад цэрквы. Пры передачы Астравецкага касцёла св. Космы і Даміяна пад праваслаўную царкву яго дах быў пераробляны – стаў больш пакатым, а над ім быў узведзены псеўдакупал з цыбулепадобнай макаўкай, які быў зняты толькі ў 30-я гады мінулага стагоддзя [3].

Парафія, у якой налічвалася больш за 14 тысяч вернікаў, засталася без храма, таму ў пачатку новага стагоддзя было вырашана будаваць новы касцёл. І ў 1910–1911 гадах на ахвяраванні парафіян пабудаваны касцёл Узнясення св. Крыжа, своеасаблівая эклектычная архітэктура якога спалучае рысы неараманскага стылю і неаготыкі. Архітэктанічна – гэта класічная трохнефавая крыжовая базіліка, змураваная з жоўтай цэглы, якая атрымала пашырэнне ў будаўніцтве Беларусі на мяжы XIX–XX стагоддзяў.

У пачатку XX стагоддзя ў сваіх архітэктурных фантазіях дойліды робяць зацікаўлены экскурс у больш глыбокае гістарычнае мінулае – да малавядомага і таму інтрыгуючага заходнееўрапейскага раманскага (ад лат. romanus – рымскі) Сярэднявечча, ажно ў ранні феадалізм X–XII стагоддзяў. Нягледзячы на тое што яго формы былі прыдатны толькі для манументальнага касцельнага будаўніцтва, вядомы намаганні ўвасобіць новую стылявую плынь і ў грамадзянскім будаўніцтве. Напрыклад, у формах раманскай архітэктуры дойлід П.Ф. Алекшын узводзіць у 1911–1913 гадах дом Кавалеўскага ў Кіеве. Неараманскі стыль набыў распаўсюджванне ў архітэктуры Польшчы пачатку XX стагоддзя, якая мела багатую архітэктурную спадчыну раманскага Сярэднявечча (кляштары і касцёлы жабрацкіх каталіцкіх ордэнаў). У 1911 годзе ў Варшаве ў неараманскім стылі ўзводзіцца касцёл Якуба (архітэктар Сасноўскі), у Кракаве – Дом тэхнічнага таварыства (архітэктар С. Аджывольскі), “Гандлёва-прамысловая ізба” (архітэктар Т. Стрыенскі, 1906 г.), касцёл Сэрца Ісуса (Ф. Манчынскі, 1914–1921 гг.).

Праз цяжкія, закрытыя, масіўныя формы, статычную прыземленасць кампазіцыі дойліды імкнуцца перадаць у архітэктуры будынкаў суровы абарончы характар раманскіх прататыпаў X–XII стагоддзяў. Для гэтага аперыруюць сістэмай простых стэрэаметрычных аб’ёмаў (кубоў, паралелепіпедаў, прызм, цыліндраў), магутнымі аркамі, цыліндрычнымі і крыжовымі скляпеннямі. Грамадзянскім будынкам надаецца крапасны характар ці воблік умацаванага замка, касцёлам – выгляд магутнай трохнефавай базілікі з масіўнымі сценамі і вежамі. Ва ўсіх выпадках архітэктурная кампазіцыя набывае статычны сакавіты характар. Будынкам уласцівы лаканізм і суровасць “рыцарскага” выгляду, які ствараецца плоскаснымі і цяжкавагавымі сценамі з рэдкімі праёмамі вузкіх арачных вокнаў, магутнымі вежамі і каменнымі канструкцыямі (адкрытай цаглянай ці каменнай часанай блочнай муроўкі, цыліндрычных і крыжовых скляпенняў, архаічных калон з грубаватымі капітэлямі), сціплым абмежаваным аркатурнымі паясамі дэкорам, умоўнасцю і абагульненасцю скульптурнага дэкору.

Касцёл Узнясення Святога Крыжа ў г. Астравец (мал. 2) пабудаваны ў 1910–1911 гадах на каталіцкім цвінтары (вул. Ленінская, 7). Урачыста ўзняты на пагорак і высокі цокаль, выкладзены магутнымі вапняковымі квадрамі. Ля касцёла быў пахаваны першы рускі консул у Японіі І.А. Гашкевіч (1814–1872; магіла не захавалася) [4].



Мал. 2. Касцёл Узнясення Святога Крыжа, Астравец

Галоўны фасад меў бакавыя двух’ярусныя чацверыковыя вежы (шатровыя завяршэнні не захаваліся); аб’ём нартэкса на ўсю шырыню запоўнены магутным перспектыўным парталам і акном-ружай над ім. Будынак пульсус рытмамі ступеньчатых контрфорсаў у прасценках высокіх арачных нефавых вокнаў-трыфорыумаў. Спічасты сілуэт ствараюць двухсхільныя шчыты тарцовых фасадаў. У адпаведнасці са стылем у аснову ўсіх праёмаў паклаладзена форма паўцыркульнай аркі. Сцены крапаваны аркатурнымі паясамі, нішамі-экседрамі, апяразаны прафіляванымі карнізамі – усё выканана ў высакаякаснай цаглянай муроўцы. Прастора інтэр’ера двума радамі слупоў расчлянёна на тры нефы, якія перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі. Па баках апсіды размешчаны сакрыстыі, над уваходам – галерэя хораў [5].

Цэнтральны неф і трансепт (папярочны неф), касцёла Узнясення Святога Крыжа, роўныя па вышыні і накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі двухсхільнымі дахамі, якія ўтвараюць у плане выцягнутыі лацінскі крыж. Па баках пяціграннай апсіды прэсбітэрыя размешчаны сіметрычныя сакрысціі. Цэнтральны неф значна выступае наперад параўнальна з бакавымі нефамі. У месцы іх злучэння пастаўлены невысокія двух’ярусныя чацверыковыя вежы, завершаныя спічастымі шчытамі, што стварае незвычайную шматпланавую структуру галоўнага фасада, па-мастацку выразную і адметную па сілуэце. Тарэц цэнтральнага нефа на ўсю шырыню прарэзвае магутны перспектыўны ўваходны партал. Над ім зроблена высокая паўцыркульная арачная ніша з акном-ружай. Шчыт, які закрывае тарэц даха, аздоблены меншымі па памерах плоскімі арачнымі нішамі, што надае фасаду вертыкальную дынаміку, пры адсутнасці вертыкаляў вежаў. Бакавыя фасады прарэзаны вокнамі-трыфорыямі і рытмічна ўмацаваны контрфорсамі. Ураўнаважаныя паўцыркульныя абрысы праёмаў, плоскіх і конхавых нішаў надаюць збудаванню сярэдневяковую манументальнасць, а высокі цокаль, вежы і контрфорсы – унутраную энергію.

Усё на свеце мае свой лёс: краіна, горад, храм, чалавек… Касцёл Узнясення Святога Крыжа нядоўга быў запатрабаваны – пасля заканчэння Першай сусветнай вайны тэрыторыя Заходняй Беларусі стала адносіцца да Польшчы, і вернікі звярнуліся да Віленскага біскупа з просьбай вярнуць ім касцёл святых Космы і Даміяна. Біскуп аддаў парафіянам касцёл. І набажэнствы сталі адбывацца ў “белым” касцёле ў цэнтры Астраўца. А ў новым імшы адпраўляліся толькі ў дні вялікіх “рочных” свят. У часы атэізму выкарыстоўваўся як гандлёвы склад. Зноў касцёл быў адкрыты ў 1994 годзе. Сто гадоў для касцёла – тэрмін не вельмі вялікі, многія храмы, у тым ліку астравецкія, ведаюць і больш глыбокія часы. Але як няма двух аднолькавых лёсаў у людзей, так няма іх і ў святынь. Касцёл Узнясення Святога Крыжа – асаблівы як сваім архітэктурным рашэннем, так і гісторыяй стварэння.

ЛІТАРАТУРА

1. Вікіпедыя. Астравец [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://be-x-old.wikipedia.org/wiki/Астравец.
2. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004. – 475 с.
3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. – Мінск, 1986.
4. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com_content&task=view&id=111&Itemid=38.
5. Кулагін, А.М. Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / А.М. Кулагін. – Мінск: Ураджай, 2000. – 107 с.

**УДК 72.05:296.735(476.6)**

## ПОМНІКІ ДРАЎЛЯНАГА САКРАЛЬНАГА ДОЙЛІДСТВА АСТРАВЕЦКАГА РАЁНА

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)***

*Паказана, што, акрамя мураваных культавых збудаванняў, на Астравеччыне ацалела некалькі каштоўных помнікаў драўлянага сакральнага дойлідства. Відавочна, што ўсе ацалелыя на сённяшні дзень помнікі драўлянага культавага дойлідства Астравеччыны маюць агульныя рысы ў аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі і вызначаюцца сціплым дэкаратыўным вырашэнні.*

Першапачаткова помнікі драўлянага культавага дойлідства Астравеччыны былі ўзведзены ў эпоху барока, потым былі рэканструяваны ці адноўлены на старых падмурках і набылі прыкметы новых архітэктурна-мастацкіх стыляў, але трывала захоўвалі традыцыі мясцовага цяслярства паўночнага захаду Беларусі.

Найбольш старажытным помнікам драўлянага дойлідства з’яўляецца касцёл Звеставання Панне Марыі ў вёсцы Гудагай (мал. 1), вядомай з канца XVI стагоддзя як уладанне Урбаноўскіх, Скірмунтаў, Садоўскіх, Козел-Паклеўскіх, Развадоўскіх, Войнаў. Архітэктанічна і прапарцыянальна гудагайскі касцёл імітуе ў дрэве формы мураваных каталіцкіх святыняў позняга барока. Выцягнуты прамавугольны аб’ём і роўная з ім пяцігранная апсіда прэзбітэрыя аб’яднаны двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром і застрэшкамі ў месцы злучэння зрубаў. Па баках прэзбітэрыя размешчаны невысокія квадратныя ў плане закрыстыі. Галоўны фасад па вуглах асноўнага аб’ёма фланкуюць дзве чацверыковыя вежы, якія раней завяршаліся яшчэ адным ярусам чацверыкоў з фігурнымі барочнымі купалкамі. Пасля рэканструкцыі галоўны фасад завершаны класіцыстычным трохвугольным франтонам з гарызантальнай ашалёўкай і вастраверхай сігнатуркай. У касцёле ёсць унутраны нартэкс, над якім на двух слупах размешчаны вялікія арганныя хоры, і экзанартэкс – невысокі вонкавы бабінец-крухта. Прасторны інтэр’ер касцёла перакрыты